**Апанасовіч Наталля Генадзьеўна**
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт
e-mail: n.apanasovich@psu.by

# АДЛЮСТРАВАННЕ БЕЛАРУСКА-ПОЛЬСКАГА ПАМЕЖЖА Ў РАННІХ АПАВЯДАННЯХ В. АДАМЧЫКА

***Анатацыя:*** у артыкуле аналізуецца адлюстраванне беларуска-польскага памежжа ў ранніх апавяданнях В. Адамчыка «Зоня» («Сэрца даруе потым»), «Свой чалавек», «На крыжавых дарогах». Разглядаюцца ўзроўні прадстаўлення і спосабы маркіравання заходнебеларускага кантэксту як мастацкай прасторы ў розныя перыяды: «за польскім часам», пад акупацыяй, у савецкі перыяд. Памежжа разглядаецца як факталагічная аснова твораў, мастацкі спосаб сэнса- і вобразавыяўлення. Асаблівая ўвага надаецца раскрыццю спецыфікі звароту да заходнебеларускай тэматыкі праз катэгорыю «свой-чужы».

***Ключавыя словы:*** В. Адамчык, беларуска-польскае памежжа, заходнебеларускі кантэкст, свой-чужы.

**Natallia Apanasovich**
Polotsk State University
e-mail: n.apanasovich@psu.by

# BELARUSIAN-POLISH BORDERLAND REFLECTION IN THE EARLY STORIES BY V. ADAMCHIK

***Abstract:*** the article analyzes Belarusian-Polish borderland reflection in V. Adamchik's early stories «Zonya» («The Heart will Forgive Later»), «Our Friend», «On the Sacred Roads». The levels of representation and ways of marking the Western Belarusian context as an artistic space in different periods are considered. They are «under Poland», under occupation, during the Soviet period. The borderland is sees as the factual basis of the works, as an artistic way of meaning- and image-expression. Special attention is paid to the disclosure of the specific Western Belarusian issues via «friend-foe» category.

***Keywords:*** V. Adamchik, Belarusian-Polish borderland, West Belarusian context, friend-foe.

Першы зборнік апавяданняў В. Адамчыка выйшаў у 1958 г. і складаўся з двух апавяданняў: «Зоня» і аднайменнага назве кнігі – «Свой чалавек». Факталагічнай асновай гэтых двух твораў, як і далейшай творчасці, стала беларуска-польскае памежжа.

Пачатак апавядання «Зоня» («Сэрца даруе потым»), паводле Г. Далідовіча, пачынаецца прызнаннем у любові ўсяму, з чым прыйшоў В. Адамчык у літаратуру [3, с. 5]: «Навагрудчына – зацішны куток майго маленства. Тут я гадаваўся і рос. Тут наша Бярозаўка, невялікая вёсачка за густым саснiком і рэдкім бярэзнікам. У гэтай вёсачцы я зведаў сябе, спазнаў пачатак людскога шчасця» [2, с. 3].

Жыццёвая наканаванасць вызначыла лёс Уладака. Хлопец пазначыў сваё паходжанне, як польскае, і ўдакладняў, што зрушыцца з месца і перасяліцца ў прымы яго бацька вымушаны быў у часы імперыялістычнай вайны. Пасля смерці жонкі, ён застаўся беззямельным – дабіцца іншага ў судзе не атрымалася, бо па законах таго часу тутэйшыя беларусы не мелі права на спадчыну [2, с. 3]. Для асірацелага ў 18 год хлопца адзіным магчымым на той момант сродкам існавання заставаліся заробкі па больш заможных суседзях. З першых радкоў В. Адамчык раскрывае драматызм гістарычнай абумоўленасці заходніка: голад у вайну і суды за спадчыну падарвалі жыццё бацькі, пасля неспадзяванай смерці якога парабчанства для сына – адзінае выйсце, а праца чорнарабочым на чыгунцы была ўдачай.

Апавяданнне «Свой чалавек» з пазіцыі сённяшняга дня чытаецца па-іншаму. Яно было прысвечана тэме калектывізацыі і адпавядала задачы паказаць тых, хто «ўжо выйшаў на роўную дарогу, але не пазбавіўся балячак свайго часу» [1, с. 2]. Асуджэнне ў В. Адамчыка атрымалася не вельмі пераканальным, затое аўтару ўдалося выразна прадставіць трагічны вобраз селяніна-працаўніка, у якім адлюстраваліся найбольш тыповыя моманты лёсу беларусаў- заходнікаў: «жыў з працы рук, у гаспадары пяўся, а радасці так і не меў і шчасце мінала яго парог» [2, с. 24]. Жыццёвая гісторыя Язэпа – гэта адначасова і ілюстрацыя адметнай лёсавызначальнай наканаванасці, і паказ шматлікіх высілкаў па пераадоленні вызначанага і дасягненні жаданага.

Пасля жаніцьбы Язэпу, аднаму з трох сыноў, са спадчынных, бацькавых «сямі дзесяцін пяску» дасталося 5 баразён. Селянін прадаў іх, узяў пазыку, купіў частку воранай зямлі ў асадніка. Шмат працаваў, сабраў грошай, набыў каня, пачаў крыху зарабляць. Падраслі дзеці, стала лягчэй. Праўдамі і няпраўдамі будаваў жытло, бо свайго лесу не меў. Паставіў хату, «як шклянку» [2, с. 24]. Наяўнасць зямлі, каня, добрай хаты, дарослых сыноў-памочнікаў – адначасова і мэта, і аснова сялянскага дабрабыту ды шчаслівай уладкаванасці. Лёс Язэпа – ілюстрацыя спробы пераадолець наканаваны лёс тутэйшага бедняка працай, гаспадарскім спрытам, абачлівасцю.

Наладжанае з цяжкімі высілкамі жыццё Язэпа незваротна парушыла вайна. Яна забрала ў яго і двух дарослых сыноў. Жыццё старэйшага скончылася ў польскім войску, малодшага – у партызанах. Не пераажаўшы страты дзяцей і разбурэння дабрабыту, памерла жонка. Адзінае, што засталося Язэпу – гора, якое ён адкрыта не паказваў, а перажываў у полі за працай і цешыўся толькі са свайго «каня» [2, с. 28].

Надыход Савецкай улады і стварэнне калгасаў – чарговае вонкавае ўмяшальніцтва ва ўжо пэўным чынам уладкаванае горкае жыццё селяніна. У калгас ён не пайшоў.

Мастацкая прастора апавяданняў першага зборніка пазначана геаграфічна дакладна – Заходняя Беларусь. Канкрэтныя рэаліі маркіруюць і вызначаюць месца, дзе пераплятаюцца і польскія, і мясцовыя («всходніх крэсаў»), і савецкія з'явы, якія з'яўляюцца гісторыка-культурным фонам, пагружаюць у складаную сацыяльна-палітычную сітуацыю часу. Статус памежжа акрэслены з геаграфічнага (Наваградчына, Ломжа, Бярозаўка, Беласток), дзяржаўна-эканамічнага, прававога, сацыяльна-культурнага бакоў. У творах распавядаецца пра жыццё заможных і беззямельных вяскоўцаў, паказваецца дзейнасць прадстаўнікоў савецкай ўлады (старшыні сельсавета, брагадзіра), закранаюцца з'явы заходнебеларускага жыцця: асадніцтва, мабілізацыя ў польскае войска, удзел у савецкім партызанскім руху, арганізацыя калгасаў.

Ужо ў першым зборніку зварот аўтара да рэалій заходнебеларускай рэчаіснасці можна разглядаць як спосаб сэнса- і вобразастварэння. У ваенна-палітычных і сацыяльна-эканамічных падзеях «всходніх крэсаў» В. Адамчык шукаў перадумовы жыццёвых перыпетый персанажаў. Гэта тое, што звонку ўплывала на ўнутранае, а значыць, разам з іншым фарміравала характар, матывавала паводзіны, вымушала дзейнічаць або скарацца. Зварот да побытавага жыцця простага чалавека, даследаванне яго лёсу менавіта праз «негераічную» будзённасць, прадстаўленыя ў ранніх апавяданнях, паступова пераўтварыліся ў адну з мастацкіх прымет Адамчыкавага ідэастылю.

Звяртае на сябе ўвагу адметнасць аўтарскай пазіцыі, якая вызначылася імкненнем да аб'ектыўнасці, непрадузятасці (наколькі гэта было магчыма ў савецкі час). Напрыклад, сквапны стары Сіўтук («Зоня»), які ўсё вымяраў выгадай, у той жа час паказаны як «цягавіты і ўвішны ў рабоце» [3, с. 8] гаспадар. В. Адамчык не выказаў адкрытага асуджэння і адмове Язэпа ўступіць у калгас. Хутчэй аўтар праявіў глыбокае спачуванне і шчыры намер зразумець жыццёвую драму селяніна: «Адбіўся чалавек ад людзей, занядбаў сябе, пастарэў. Што ў яго на сэрцы цяпер, чаму не гаворыць, маўчыць ўсё? Ды ад каго староніцца, на каго наракае?» [2, с. 28]

Назва першага зборніка «Свой чалавек» мае ідэалагічную канатацыю. У кантэксце савецкай літаратуры гэта можа быць зразумета наступным чынам: «свой» – пакутнік лёсу, класавай несправядлівасці і эксплуатацыі, «чужы» – хціві прыгнятальнік, які ўсё вымярае нажывай, нават шчасце сваёй дачкі (Сіўтук). Разам з тым, з першых твораў заўважна разуменне В. Адамчыкам таго, што жыццё значна больш складанае за прапанаваныя схемы, а людзі не бываюць толькі станоўчымі ці адмоўнымі. Мяркуем, што малады на той час аўтар, вырашаючы праблемы ў маральна-этычным плане, не ставіў перад сабой задачу канфліктаваць з ідэалагічнымі

патрабаваннямі. Але яго імкненне да праўдзівасці і аб’ектыўнасці ў адлюстраванні жыцця дазволілі зазірнуць крыху далей за прынятыя стэрэатыпы і стварыць супярэчлівыя характары, паказаць неадназначнасць учынкаў, адлюстраваць цярністасць і непрадказальнасць чалавечых лёсаў.

У гэтым сэнсе беларуска-польскае памежжа дало магчымасць пашырыць межы сацрэалізму, паназіраць за складаным, выявіць супярэчлівае. Выразным прыкладам гэтага можа быць раскрыццё праблемы «свой-чужы», якая з улікам кантэксту памежжа ўспрымаецца больш рознапланава і ў першым, і ў другім («Млечны шлях», 1960), і ў наступных зборніках апавяданняў В. Адамчыка савецкага часу.

Лакалізацыя мастацкай прасторы на заходнебеларускіх землях, дазволіла паказаць спрэчнасць прававога статусу беларуса памежжа. Жыхары «всходніх крэсаў» юрыдычна і эканамічна падзяляліся на «сваіх» і «чужых» на дзяржаўным узроўні. Нават фармальная прыналежнасць да палякаў тутэйшаму беларусу не давала права на спадчыну, а для доказу віны хапала падазрэнняў і домыслаў з боку сапраўдных і статусных палякаў. Менавіта па падазрэннях пастарунка і пана Ліцвінскага быў асуджаны да турэмнага зняволення Саўка Лазовік з апавядання «На крыжавых дарогах» (зборнік «Млечны шлях») [2, с. 66].

З прыходам савецкай улады з’явілася катэгорыя «нашы». Так мясцовым насельніцтвам успрымалася савецкая ўлада, якая была чаканай, прымалася за «сваю». Саўку Лазовіка з наваградскай турмы, Алеся Макарчыка з Гродна, якія сядзелі за вывешаны чырвоны сцяг, вызвалілі праз год «нашы». У «нездароўчых і нядужых» праз зняволенне былых парабкаўцаў з прыходам новай улады з’явілася надзея і на змены лёсу: «Новае жыццё настала, па-новаму неяк і жыць трэба» [2, с. 67].

Мяркуем, што В. Адамчык, перадаючы аптымістычны настрой і радасныя спадзяванні вяскоўцаў, звязаныя з прыходам Саветаў, не перабольшваў. Людзі, сапраўды, спадзяваліся на лепшае. Але разам з тым, раскрываючы матывы і прычыны паводзін сваіх персанажаў, не ўвачавідкі, а праз дробныя дэталі, штрыхі, пісьменнік настойліва пашыраў межы адназначнасці, паглыбляў ракурс таго, што адбывалася.

У якасці прыкладу можна звярнуцца да лёсу Алеся Макарчыка («На крыжавых дарогах»). Былы парабак і палітвязень, савецкай уладай аўтаматычна прылічаўся да «сваіх». Дробязная заўвага дазволіла засумнявацца ў асэнсаванай прыхільнасці Алеся да сацыялістычнага руху і паказала, як асобныя ўчынкі ў жыцці чалавека вызначаюць асабісты лёс і ў той жа час звязваюць яго з ходам гісторыі. Рыгор Падліпскі, блізкі сябра Макарчыка, які і падгаварыў яго вывесіць чырвоны сцяг, прызнаецца, што не ведае, чаму сябар згадзіўся ўдзельнічаць у рызыкоўнай справе: «Не ведаю, ці то з вялікай злосці на пана Ліцвінскага, ці то ад сваёй абыякавасці і паслухмянасці, Макарчык даў згоду» [2, с. 62].

З прыходам Саветаў «новае жыццё настала», і ў 27-гадовага хлопца з’явілася надзея стварыць сваю сям’ю, завесці гаспадарку. Натуральны ў такой

камунікатыўнай сітуацыі займеннік «свае», выказаны ў шчырай гаворцы сяброў, не набывае нейкага дадатковага значэння і мае прамы сэнс. Пераасэнсаванне яго як найважнейшага каштоўнаснага, светапогляднага паняцця персанажа, рэпрэзентацыя апазіцыйнага зместу з «чужым», напаўненне лёсавызначальным зместам адбываецца толькі ў фінальнай частцы апавядання.

Стварэнне калгасаў правяло фатальную пераразмеркавальную мяжу паміж людзьмі, развяло ў супрацьлеглыя бакі і зрабіла ворагамі жыхароў адной вёскі, блізкіх сяброў, што «разам ваявалі, панскія турмы адседжвалі, партызанку ўсю прайшлі» [2, с. 71].

Відавочная для сённяшнага часу думка аб тым, што гісторыя калгасаў звязана не толькі з будаўніцтвам новага «лепшага» жыцця, але і з вялікай колькасцю трагедый, што адбыліся на сялянскіх падворках, распачата ў ранніх апавяданнях В. Адамчыка. Гэты другі ракурс вясковага жыцця ілюструюць трагічныя лёсы Язэпа, Алеся Макарчыка і многіх іншых персанажаў з пазнейшых апавяданняў В. Адамчыка.

«Сапраўдны партызан», «калісь беззямельны», Алесь Макарчык, цешыўся з таго, што меў сваю гаспадарку. Ён лічыў, што выгараваў, заслужыў гэта лепшае жыццё пра Саветах. Стварэнне калгасу, якое ўспрымалася вяскоўцамі як неабходнасць зруйнаваць ўсё, што складала сэнс жыцця, моцна і балюча адбівалася на сялянскай псіхіцы. Спачатку прывяло да надлому, а потым і да жыццёвай трагедыі: замаху на забойства. Алесь ледзь не застрэліў старшыню калгаса, былога сябра і паплечніка [2, с. 73–74]. Вызваліўшыся з турмы, Макарчык у роднай вёсцы не застаўся, а забраў сям'ю і «перакінуўся не то ў Данбас, не то ў Карэлію» [2, с. 57].

Упершыню ў апавяданні «На крыжавых дарогах» закранаецца і тэма савецкіх рэпрэсій. В. Адамчык не канкрэтызуе, што было зроблена прадстаўнікамі саветаў (і ці было?) Макарчыкам і Падліпскім, пазначае толькі, што «ў вёсцы пайшла чутка» аб іх дачыненні да высылкі заможнага Дойлы [2, с. 67]. Відавочнасць небяспекі стала зразумелай пасля стрэлу ў хату Алеся ды «плявузганняў» п'янага Слімака пра расплату [2, с. 68]. Абагульнена пазначаны і ўзровень рызыкі: «дома на кожным кроку чакала ўсякае» [2, с. 68]. У апавяданні не ўдакладняецца і не высвятляецца сапраўдная далучанасць персанажаў да карнай машыны. На нашу думку, гэта зроблена мэтанакіравана, каб падкрэсліць фармальнае, аўтаматычнае далучэнне чалавека да таго або іншага лагеру.

Дазволім выказаць меркаванне, што ўжо ў ранніх апавяданнях аўтар імкнуўся паглыбіць асэнсаванне рэчаіснасці, выйсці за ідэалагічны ўзровень «адплаты – помсты» і паказаць мусовую ўключанасць чалавека ў кола гісторыі, хуткаплыннасць таго, што адбывалася, адлюстраваць частыя і неаднаразовыя змены ролямі «карнікаў» і «ахвяр».

Асабліва выразна гэта сітуацыя праявілася з пачаткам вайны, якую В. Адамчык паказвае як час неразбярыхі. Небяспека для вяскоўцаў сыходзіла і ад помслівых аднавяскоўцаў, і ад немцаў, а сыход у парызаны для галоўных герояў стаў адзіным магчымым выбарам [2, с. 71]. Менавіта для паказу гэтай уключанасці і залежнасці вяскоўцаў ад абставін, В. Адамчык звяртаецца да ваеннага часу ў Заходняй Беларусі, дзе на працягу вельмі кароткага тэрміну адбываліся кардынальныя змены статусу тэрыторыі і яе жыхароў: «за польскім часам», пры Саветах і пад акупацыяй. Ілюструе гэту сітуацыю і гаваркая назва апавядання – «На крыжавых дарогах», якая ў далейшай творчасці стала вобразным тлумачэннем звароту аўтара да факталогіі памежжа як перакрыжавання гістарычных калізій і жыццёвых перыпетый беларусаў.

З пэўнасцю можна сцвярджаць, што зварот да заходнебеларускага кантэксту ад самага пачатку творчасці быў зроблены В. Адамчыкам свядома і мэтанакіравана. Рэаліі заходнебеларускага жыцця выкарыстоўваліся не толькі ў якасці фармальнай дэкарацыі, а мелі значэнне істотнай крыніцы даследавання беларускага народнага лёсу, сталі крыніцай фармавання аўтарскага стылю. Памежжа, як мастацкая прастора, маркіравана дакладна і living рознабакова, прадстаўлена з прыродна-геаграфічнага, эканамічна-прававога, сацыякультурнага бакоў. Адзін са спосабаў асэнсавання сітуацыі выяўлены праз каэгорыю «свій – чужы», якая дазволіла аўтару паглыбіцца ў спецыфіку заходнебеларускага кантэксту і раскрыць супярэчлівасць ўспрыняцця ў савецкі час ідэалаў вясковага жыцця, закрануць праблемы калектывізацыі, рэпрэсій. Памежжа ў апавяданнях прадстаўлена як перакрыжаванне гісторыі і лёсаў вяскоўцаў. Менавіта ў мінулым заходнебеларускай зямлі В. Адамчык шукаў адказы на пытаніі аб спецыфіцы беларускай ідэнтычнасці, прадвызначанасці будучыні народа.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ


1. Адамчык, В. Млечны шлях : апавяданні / В. Адамчык. – Мінск : Дзяржаўнае выдавецтва БССР, Рэдакцыя мастацкай літаратуры, 1960. – 143 с.
2. Адамчык, В. Свой чалавек : апавяданні / В. Адамчык. – Мінск : Дзяржаўнае выдавецтва БССР, Рэдакцыя мастацкай літаратуры, 1958. – 30 с.
3. Далідовіч, Г. Крокі да вялікай кнігі / Г. Далідовіч // ЛіМ. – 1980. – 6 чэрвеня. – С. 5–7.